БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР

# Алесь Адамовіч

## Партызаны

БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР

Серыя распрацавана
ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Заснавана ў 1996 годзе

Аўтар праекта і галоўны рэдактар серыі
*Кастусь Цвірка*
Намеснік галоўнага рэдактара
*Галіна Тычко*

Рэдакцыйная рада

Аляксандр Каваленя, старшыня
Станіслаў Нічыпаровіч, намеснік старшыні
Іван Саверчанка, намеснік старшыні
Ірына Багдановіч
Анатоль Бутэвіч
Уладзімір Васілевіч
Яўген Гарадніцкі
Уладзімір Гніламёдаў
Ганна Запартыка
Міхась Тычына
Вячаслаў Чамярыцкі

*Серыя І. Мастацкая літаратура*

# АЛЕСЬ АДАМОВІЧ

# Партызаны

*Дылогія*

*Пераклад з рускай*
*Ірыны Шаўляковай*

Мінск
«Беларуская навука»
2022

379048-Б

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
А28

Прадмова
Уладзіміра Бойкі

Навуковы рэдактар
доктар філалагічных навук, прафесар
Іван Саверчанка

Пераклад зроблены з выдання:
Адамович, А. Избранные произведения. В 4 т. Т. 1. Война под крышами ; Сыновья уходят в бой / Алесь Адамович. – Минск : Мастац. літ., 1995.

**Адамовіч, А.**

А28 Партызаны : дылогія / Алесь Адамовіч ; пер. з рус. Ірыны Шаўляковай ; прадм. Уладзіміра Бойкі. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 604 с. : [4] л. іл. – (Беларускі кнігазбор : БК. Серыя I, Мастацкая літаратура).

ISBN 978-985-08-2871-2.

Дылогія «Партызаны», напісаная вядомым беларускім пісьменнікам, літаратуразнаўцам, кінасцэнарыстам і крытыкам А. М. Адамовічам (1927–1994), складаецца з двух раманаў – «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Гэты твор – адзін з выдатных узораў беларускай ваеннай прозы. На беларускай мове друкуецца ўпершыню.

Сто дзявяты том кніжнага праекта «Беларускі кнігазбор».

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-08-2871-2**

© Шаўлякова І., пераклад
на беларускую мову, 2022
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом
«Беларуская навука», 2022

БИБЛИОТЕКА
БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО
МЕДИЦИНСКОГО УНИВЕРСИТЕТА

# АДРАСАВАНА КОЖНАМУ

> Задача пісьменніка нязменная.
> Сам ён змяняецца, але задача
> яго застаецца тая ж. Яна заўсёды
> ў тым, каб пісаць праўдзіва
> і, зразумеўшы ў чым праўда,
> выявіць яе так, каб яна ўвайшла
> ў свядомасць чытача,
> часткаю яго ўласнага вопыту.
> *Эрнэст Хэмінгуэй*

Проза Алеся Адамовіча праўдзівая. Ён ведае жыццё. Паўпраўда яму агідная. Не аднойчы сцвярджаў пісьменнік неабходнасць паказваць вайну не такой, якой хацелася б, каб яна была, а такой, якой была на самай справе. Зразумела, не толькі на паказ і вытлумачэнне вайны распаўсюджваецца гэты прынцып.

Літаратура, пра што б ні расказвала, заклікана здабываць праўдзівыя веды пра чалавека, не абмінаючы складанасці быцця, успрымаць жыццё такім, якім яно ёсць – ні лепшым, ні горшым. Сцвярджаючы гэтыя прынцыпы як вучоны-літаратуразнаўца і крытык, Алесь Адамовіч адрасуе іх і сабе як празаіку.

Сёння, перачытваючы дылогію – раманы «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой», можна толькі здзіўляцца, як Адамовічу ў тыя далёкія гады ўдалося ўтрымацца на тым узроўні праўды пра вайну, які дасюль прыцягвае чытацкую цікавасць. Ён пачынаў пісаць «сваю вайну» з другога рамана (1948–1950), а потым узяўся за першы і, надрукаваўшы яго (1960), змог закончыць другі (1963). Немалаважная акалічнасць. Яна досыць паказальная для разумення цяжкасцей, якія пераадолеў раманіст.

У раманах дылогіі заяўлена праблематыка ўсіх наступных твораў пісьменніка. І «Хатынская аповесць», і «Карнікі», і дакументалістыка паглыбілі і пашырылі многае з таго, што ў дылогіі было толькі «пазначана» ў меру магчымасцей кароткачасовай «адлігі». Пісьменніку ўдалося галоўнае: ён стварыў сумленную прозу пра падполле і партызанаў Беларусі ў гады фашысцкай акупацыі.

У Адамовіча ёсць свая ацэнка дылогіі. Не аднойчы ўзнікала і жаданне перапісаць яе. На шчасце, ён гэтага не зрабіў. А вось моманты «прадчування» іншых твораў хутчэй за ўсё перамяніліся б настолькі, што ў выніку зніклі б тыя нервы абодвух раманаў, якія робяць іх мастацкім дакументам не толькі часу апісанага, але і часу пасля напісання. Знік бы, скажам, аўтапартрэт пісьменніка часоў «адлігі». Гэты персанаж мае адносіны да ступені дакументальнасці дылогіі, надзвычай высокай яшчэ і па прычыне мастацкай праўдзівасці. Чытаючы дылогію, адчуваем значнасць чалавечай натуры яе аўтара, глыбіню яго адчуванняў, бачання, мыслення. А ў канчатковым выніку – чалавечага і пісьменніцкага таленту.

Абодва раманы дылогіі напоўнены персанажамі. Псіхалагічныя зрухі ў душах Толі Корзуна і Ганны Міхайлаўны прасочаны скрупулёзна. І таму гэтыя і іншыя вобразы ў дылогіі пераканаўчыя, паказаны ва ўзаемасувязі. Тут пераканаўчы і які-небудзь вясковец, што прамільгнуў падчас партызанскай аперацыі, і салдаты нямецкай арміі, выяўленныя двума-трыма радкамі тэкста, і мноства іншых не названых персанажаў, якія трапілі ў поле зроку Толі.

Народ малюе пісьменнік, народ на пераломе лёсу. І, як у фокусе, лёсы народныя сканцэнтраваныя ў вобразах Ганны Міхайлаўны, Толі і іх акружэння.

На першы погляд здаецца, што Толя – галоўны герой дылогіі. Так лічаць многія. Ды і сам пісьменнік, відаць, так лічыў, хоць адзначыў: «Гэтую кнігу перш маці напісала сваім жыццём». Ганна Міхайлаўна з першага яе з'яўлення на старонках «Вайны пад стрэхамі» выходзіць на першы план – яе вачыма бачым, яе сэрцам адчуваем «галоўнага» і «першапланавага»

Толю. Ён наскрозь прасякнуты токамі, якія ідуць ад Маці, надта звязвае малодшага сына з ёю ўсё яшчэ не парушаная «псіхалагічная пупавіна» – адсюль і Толева пачуццё ўнутранага дыскамфорту, калі маці нагадвае яму, што ён ледзьве не дзіця, а яму не церпіцца сцвердзіцца ў дарослай.

Гэтыя два «галоўныя» пункты гледжання, гэтыя два «галоўныя» ўспрыманні таго, што адбываецца, – Ганны Міхайлаўны і Толі – даюць Адамовічу магчымасць судакрануцца з праўдай вайны і міру ў такіх аспектах, якія не выключаюць і адведзенага на далёкія планы ўсяго, пра што заявіць «занадта гучна» падчас стварэння раманаў яшчэ не прыйшла пара.

Вакол Ганны Міхайлаўны і Толі ў раманах сканцэнтраваны ўсе: старэйшы Толеў брат, усе сваякі – ад дзядулі і бабулі да маленькай Інкі, Надзінай дачкі, жыхары Лясной Сялібы – прыязна альбо варожа настроеныя суседзі, падпольшчыкі і паліцаі, партызаны і акупанты.

Два эпіцэнтры. Два галоўныя светачы… Толя і Ганна Міхайлаўна. Толя – самая блізкая да Ганны Міхайлаўны «псіхалагічная арбіта». Затым ужо – старэйшы Толеў брат і іншыя сямейнікі. Звычайная савецкая сям'я, якая жыла сумленна, як многія іншыя, але знаходзілася пад падазрэннем і ў савецкіх чыноўнікаў, а потым, у акупацыі, у фашыстаў. Галава сям'і, прамільгнуўшы на першых старонках, прысутнічае толькі ва ўспамінах персанажаў з розных нагод. Ён адна з кропак маральнага адліку ў справах і думках Ганны Міхайлаўны. Толя як быццам супраціўляецца імпульсам, што ідуць ад бацькі, але разам з мацярынскімі імпульсамі ў ім рэалізуецца маральны пачатак, які ўзыходзіць да старэйшага, да галоўнага Корзуна, што змагаецца дзесьці ў рэгулярнай арміі.

Сэрца Ганны Міхайлаўны абліваецца крывёй. У ім месца не толькі для блізкіх, для сям'і. Для ўсіх. І для Віктара, забітага ў няроўным баі пры выкананні задання падпольшчыкаў – аптэкарцы Ганне Міхайлаўне стараўся лекі здабыць. І для палонных, якіх яна ратуе. І для кожнага з партызанаў, што судакранаюцца з ёй. Натуральны дзіцячы эгацэнтрызм і афарбаваная рамантыкай мройлівасць Толі, які на нашых вачах становіцца

падлеткам, сутыкаюцца з жорсткімі ўрокамі жыцця. Менавіта такога, якім жыццё ёсць на самай справе, а не ўяўленага Толем.

Пранікаючы ў самыя нетры трагедыі вайны, Адамовіч заяўляе пра сябе як пра сталага мастака слова і мысляра. І мае рацыю Янка Брыль, які лічыць вобраз Ганны Міхайлаўны найвялікшым дасягненнем нашай прозы. З аднаго боку, Ганна Міхайлаўна безабаронная перад дамоклавым мячом трагічных выпадковасцей «вайны пад стрэхамі» і партызаншчыны, калі «сыны ідуць у бой». З другога боку, яна падпарадкоўваецца высокаразвітаму ў ёй пачуццю маральнага абавязку – адказнасці перад усімі сумленнымі людзьмі. Далёка на задні план адыходзяць крыўды, нанесеныя савецкай уладай. Ганна Міхайлаўна разрываецца паміж мацярынскім інстынктам і пачуццём адказнасці за агульную справу, паміж усвядомленай воляй да барацьбы і пастаянным страхам страціць сыноў. Не толькі за блізкіх баліць яе сэрца. Навокал – кроў і смерць, а дзеці для маці заўсёды дзеці – і свае, і не свае, нават, калі яны ўжо стаяць у шарэнзе са зброяй у руках.

Апошнія старонкі дылогіі – думкі Ганны Міхайлаўны: «Калі-небудзь маці не будуць разумець, як гэта дзеці нашы забівалі, а мы былі побач. Якія яны шчаслівыя, што ім гэта будзе незразумела».

А ці наступіла гэтае **калі-небудзь**?

*Уладзімір Бойка*

## ЗМЕСТ

Адрасавана кожнаму *Уладзімір Бойка* ........................ 5

ВАЙНА ПАД СТРЭХАМІ

*Частка першая.* Вайна ўваходзіць у дом ........................ 11

Дагнаныя бурай ........................ 11
Немцы! ........................ 27
У пасёлку ........................ 37
«Маральны кантакт» ........................ 45
Сям'я расце ........................ 56
Жыгоцкія ........................ 60
Павел ........................ 65
Бой ........................ 67
«Толікі» ........................ 77

*Частка другая.* Дом мой – крэпасць мая ........................ 84

«Прыехаў» Віктар ........................ 84
Толя піша вершы ........................ 91
З немцамі па-нямецку ........................ 101
Віктар ачуняў ........................ 106
Гоняць палонных ........................ 113
Мама і Грабоўская ........................ 117
Першая зіма ........................ 121
Мама працуе ........................ 129
«Хлопцы» ........................ 136
Другое лета ........................ 141
Толя ідзе па шашы ........................ 153
Дзіўны немец ........................ 156
Абнавілася начальства ........................ 158
Справы начныя і дзённыя ........................ 161
Толя бяжыць да Лесуна ........................ 165
Падаруначак ........................ 172
Рэпетыцыя ........................ 177